

# Для даследчыкаў маленькіх і дарослых

У «Клубе кніжных прафесараў» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбыліся заняткі «Кніжная культура Радзівілаў». Гэты магнацкі род пакінуў адметны след у гісторыі развіцця кніжнай культуры – яго прадстаўнікі засноўвалі друкарні і бібліятэкі, былі аўтарамі кніг.

Міхал Казімір Радзівіл Рыбанька, вялікі гетман літоўскі, у 1750 г. атрымаў дазвол ад караля Аўгуста III на адкрыццё друкарні ў Нясвіжы. Праз год перадаў яе езуітам, але надалей падтрымліваў фінансава. Друкарня праіснавала прыкладна паўстагоддзя і служыла пераважна Радзівілам і мясцоваму езуіцкаму калегіуму.

Францішка Уршуля Радзівіл, жонка вялікага гетмана літоўскага Міхала Казіміра Рыбанькі, вядомая найперш як стваральніца ў нясвіжскай рэзідэнцыі Радзівілаў самабытнага тэатра, для якога пісала п'есы і ставіла іх на сцэне. Змест тэатральнага рэпертуару складалі творы Уршулі, апублікаваныя ў Нясвіжскай друкарні, адкрытай таксама з удзелам княгіні. Першае нясвіжскае выданне збору твораў «Камедыі і трагедыі» з'яўляецца вельмі рэдкім. Нацыянальная бібліятэка Беларусі валодае асобнікам другога выдання (Жоўква, 1754). Яно мае цікавыя гравюры, застаўкі і канцоўкі, выкананыя гравёрам Міхалам Жукоўскім.

Дзеці, удзельнікі заняткаў, пабачылі нясвіжскія выданні XVIII ст. і кнігі з бібліятэкі Радзівілаў з экслібрысамі, а таксама адзіны ў Беларусі асобнік кнігі «Камедыі і трагедыі».

Творчым заданнем было стварыць тэатральныя дэкарацыі да пастановак паводле кнігі «Камедыі і трагедыі» Уршулі Радзівіл. Маленькія дэкаратары вырабілі макеты, што ўяўлялі ў мініяцюры сцэну з кулісамі і заслонамі, знайшлося месца гербу Радзівілаў і гравюрам са старадруку XVIII ст.

А 27 сакавіка прайшоў навукова-практычны семінар «Крыніцы па генеалогіі ў беларускіх архівах і бібліятэках», што арганізавалі Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі.

Вядома, што асноўныя крыніцы па генеалогіі ў нашай краіне сканцэнтраваныя ў НГАБ у Мінску і НГАБ у Гродне, але значная частка каштоўных дакументаў захоўваецца ў бібліятэках, музеях, прыходскіх архівах і нават у прыватных калекцыях. Адна з задачаў семінара – папулярызацыя рукапісных скарбаў НББ, дзе захоўваецца істотная, але пакуль мала вядомая шырокім колам даследчыкаў, калекцыя дакументаў генеалагічнага характару першай паловы XVIII – пачатку XX ст. Гэта пераважна метрычныя кнігі аб нараджэннях, шлюбах і пахаваннях з праваслаўных, уніяцкіх і каталіцкіх храмаў розных куткоў Беларусі.

З дакладамі выступілі кандыдат гістарычных навук, намеснік дырэктара НГАБ Дзяніс Лісейчыкаў («Архівы і генеалагічны бум: дзе і як шукаць сваіх продкаў»), кандыдат гістарычных навук, загадчык сектара тэматычных даследаванняў і выставачнай дзейнасці аддзела выкарыстання дакументаў і інфармацыі НГАБ Вадзім Урублеўскі («Генеалагічная асвета ў Беларусі на сучасным этапе»), загадчык сектара рэдакцыйна-выдавецкай падрыхтоўкі аддзела публікацыі дакументаў НГАБ Яўген Глінскі («Фальсіфікацыі генеалагічных дакументаў: як выявіць старажытную падробку?»), загадчык НДА кнігазнаўства, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Анатоль Сцебурака («Рукапісныя крыніцы па генеалогіі ў фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі»).

*Паводле матэрыялаў навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства НББ*

